*К. А. Чыкаванава* (УА «Аршанскі каледж Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава»)

# ДАСЛЕДЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ЯК КАМПАНЕНТ АДАПТЫЎНАГА АСЯРОДДЗЯ НАВУЧАННЯ

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца арганізацыя адаптыўнага асяроддзя навучання для малодшых школьнікаў, у прыватнасці прыёмы арганізацыі даследчай дзейнасці вучняў на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання як кампанента гэтага асяроддзя. Дадзеная праблема надзённая, бо стварэнне адаптыўнага асяроддзя навучання заклікана дапамагчы пабудаваць індывідуальную траекторыю развіцця кожнага дзіцяці з улікам яго асаблівасцей, здольнасцей і схільнасцей.

Асноўным накірункам вучэбна-выхаваўчага працэсу ў айчынных школах на сучасным этапе з'яўляецца фарміраванне творчай асобы чалавека як важнейшага сацыяльнага гаранта прагрэсу ўсяго грамадства.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Ку

Задача сучаснай сістэмы адукацыі не столькі ў тым, каб узброіць навучэнцаў як мага большым аб'ёмам ведаў, колькі ў тым, каб навучыць іх здабываць гэтыя веды і самастойна арыентавацца ў вялікай колькасці інфармацыі. Вырашэнне гэтай задачы прадугледжвае індывідуалізацыю адукацыйнага працэсу, пабудову індывідуальных адукацыйных траекторый. Гэтыя фактары садзейнічаюць, з аднаго боку, раскрыццю ўнутраных рэзерваў навучэнцаў, з другога, – фарміраванню сацыяльных якасцей асобы (уменне працаваць у калектыве, выконваючы разнастайныя сацыяльныя ролі, дапамагаючы адзін аднаму ў сумеснай дзейнасці).

Трэба адзначыць, што адной з праблем арганізацыі навучання выступае той факт, што ў школьных класах знаходзяцца вучні з розным узроўнем матывацыі да навучання. Гэта можа прывесці да зніжэння пазнавальнай актыўнасці, ініцыятывы вучня. З цягам часу незапатрабаванасць асобаснага патэнцыялу замаруджвае рух школьніка наперад, вучэбная матывацыя саступае месца пазіцыйнай, адносіны да вучобы і ведаў становяцца фармальнымі. Выхадам з такой сітуацыі, на наш погляд, з'яўляецца стварэнне адаптыўнага асяроддзя навучання. Эфектыўна функцыянуючы, адаптыўнае асяроддзе дазволіць зрабіць навучанне і выхаванне камфортным, накіраваным на кожнага канкрэтнага школьніка.

Дыдактычная сістэма адаптыўнага навучання павінна адрозніваецца аптымальнасцю, камфортам для настаўніка і вучняў у рэалізацыі навучальнага ўзаемадзеяння і адпавядаць кожнай канкрэтнай педагагічнай сітуацыі. Галоўнай характарыстыкай адаптыўнай мадэлі з'яўляецца яе рухомасць за кошт дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі навучання, якая грунтуецца на ўліку псіхафізіялагічных асаблівасцей вучняў, іх схільнасцей, здольнасцей, пры гэтым абавязкова выкарыстанне кампенсуючай дыягностыкі і карэкцыі.

Прыярытэтнымі элементамі адаптыўнага асяроддзя адукацыйнага працэсу з'яўляюцца наступныя: стварэнне добразычлівых умоў для развіцця кожнага навучэнца ў адпаведнасці з яго сацыяльна-духоўнай і фізічнай прыродай; вызначэнне мэты, стратэгіі, тэхналогіі пабудовы адукацыйнага асяроддзя; прыярытэт каштоўнасных адносін, матываў дзейнасці ў час адбору зместу адукацыі; фарміраванне ўяўлення пра псіхалагічную дапамогу і педагагічную падтрымку ў сістэме навучання і выхавання; авалоданне рэфлексіяй уласнай дзейнасці; набыццё навыкаў канструявання сітуацый, праектаванне гуманных узаемадачыненняў у дыдактычнай сістэме [1, с. 7].

Аналіз адпаведнай метадычнай літаратуры дазволіў вылучыць наступныя зыходныя палажэнні пабудовы мадэлі адаптыўнага навучання малодшых школьнікаў: кожны школьнік мае індывідуальныя асаблівасці, якія праяўляюцца ў яго паводзінах, дзеяннях, узаемаадносінах з нава-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

кольным асяроддзем, гэтыя асаблівасці ў значнай ступені абумоўліваюць характар вучня; у кожнага школьніка індывідуальны ўзровень развіцця і індывідуальны спосаб ўспрыняцця вучэбнага матэрыялу; улічваючы пералічаныя асаблівасці, педагог выбірае індывідуальны стыль вучэбнай дзейнасці.

Адаптыўнае адукацыйнае асяроддзе вучня фарміруецца там, дзе ў пэўнай сістэме спалучаюцца пазітыўныя, камфотныя адносіны педагога і школьніка, рэалізуецца іх рэсурсны патэнцыял і патэнцыял адукацыйнага асяроддзя.

Такім чынам, арганізацыя адаптыўнага асяроддзя ў навучальнай установе з'яўляецца эфектыўным сродкам для развіцця творчай асобы школьніка. Арганізацыі і функцыянаванню дадзенай сістэмы спрыяе вырашэнне пэўных педагагічных задач: развіццё пазнавальных, псіхічных працэсаў у малодшых школьнікаў; фарміраванне і развіццё асобасных якасцей; развіццё эмацыянальна-духоўнай сферы вучняў.

Важнае месца ў стварэнні адаптыўнага асяроддзя займае такі від дзейнасці, як даследчая дзейнасць. Гэта асаблівы від дзейнасці, які ўзнікае ў выніку функцыянавання механізму пошукавай актыўнасці і будуецца на базе яе даследчых паводзін. Суб'ектыўнымі ўмовамі паспяховага ажыццяўлення даследчай дзейнасці з'яўляюцца даследчыя здольнасці як індывідуальныя асаблівасці асобы [2, с. 50].

Вылучаюць наступныя прыярытэтныя накірункі даследчай дзейнасці малодшых школьнікаў: фарміраванне спосабаў навуковага пазнання ў працэсе пошуку неабходнага матэрыялу; фарміраванне станоўчай матывацыі да даследчай дзейнасці; набыццё вучнямі ўсвядомленых, аператыўна выкарыстоўваемых ведаў; развіццё творчага і крытычнага мыслення малодшых школьнікаў.

Існуюць разнастайныя формы заняткаў на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання, якія дазваляюць арганізаваць як даследчую дзейнасць малодшых школьнікаў, так і прад'яўленне яе вынікаў: канферэнцыя, прэзентацыя, выступленні, выставы дасягненняў і інш. Галоўнае, каб работа ў дадзеным накірунку праводзілася сістэмна.

Для сістэматычнага выкарыстання на ўроках мовы і літаратурнага чытання мэтазгодна выкарыстоўваць заданні тыпу "Складзіце апавяданне ад імя …". У якасці адрасанта і адрасата могуць выступаць разнастайныя людзі: складзіце пісьмо куміру, абвінаваўчую прамову супраць мяккага знака, скаргу ад імя аўтаручкі, заклік прыроды да людзей і інш. У працэсе выканання такіх заданняў малодшыя школьнікі знаёмяцца з рознымі жанрамі маўленчай дзейнасці, іх асаблівасцямі, вучацца будаваць свае выказванні ў залежнасці ад прызначэння і жанраў дзейнасці. Настаўніку мэтазгодна

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

прапаноўваць школьнікам некалькі варыянтаў задання ў залежнасці ад магчымасцей дзяцей, іх унутраных запатрабаванняў і матывацыі.

Развіццю даследчых уменняў вучняў, фарміраванню ўменняў супастаўляць, параўноваўваць, рабіць вывады спрыяе прыём "работа з паняццем". У працэсе аналізу мастацкага твора вучні разглядаюць прапаноўваемае настаўнікам паняцце (часцей за ўсё гэта галоўнае слова (тэма) вывучаемага твора) з розных бакоў: раскрываюць лексічнае значэнне слова, падбіраюць сінонімы і антонімы да яго, вызначаюць станоўчыя якасці і недахопы разглядаемага паняцця. Вынікі работы вучні прадстаўляюць у выглядзе табліцы, у працэсе запаўнення якой школьнікі актыўныя ў пошуку адказаў, што не даюцца ў "гатовым" выглядзе, а патрабуюць аналізу, логікі разваг, творчага падыходу, работы са слоўнікамі.

У адаптыўнай сістэме магчыма выкарыстанне разнастайных тэхналогій, метадаў і прыёмаў. Галоўнае, каб у комплексе тэхналогій структураваўся не толькі змест адукацыі, але і сама дзейнасць навучэнцаў з акцэнтам на самастойную работу, самаразвіццё асобы, яе актыўнасці і творчага пачатку. Сістэмна выкарыстоўваючы даследчы метад у функцыянаванні адаптыўнага асяроддзя, настаўнік дасягае павышэння пазнавальнай актыўнасці малодшых школьнікаў, развіцця творчасці ў падыходах да выканання прапанаваных заданняў.

## Літаратура


1. *Ковальчук, В. В.* Творческие основы адаптивного обучения / В. В. Ковальчук // Пачатковая школа. – 2006. – № 3. – С. 7–10.
2. *Криволап, Н. С.* Исследовательская работа школьников / Н. С. Криволап. – Мінск : Вышэйшая школа, 2005. – 254 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова